**9 (182)**
**верасень**

**Выдаецца са студзеня 1993 г.**

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

**Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)**

**НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Елізараў — Фінансы Савецкай Беларусі (1919 — вясна 1921 г.): на шляху да камунізму 6

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Вабішчэвіч — Стан і захаванне воінскіх пахаванняў Першай сусветнай вайны ў Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. 15

КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

Аляксандр Гужалоўскі — Экспертыза каштоўнасці архіўных дакументаў у БССР у 1944—1991 гг. 23

## ЗМЕСТ


ГІСТОРЫЯ РЭЛІГІІ

Павел Шаўкун — Праваслаўная царква ВКЛ у другой палове XVI ст. — 29

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

Надзея Кушнер — Міжнародная алімпіяда па гісторыі — 38

Вячаслаў Лазіцкі — Арганізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з выкарыстаннем табліц пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе — 42

Святлана Падкапаева — Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта *(V клас)* — 49

Таццяна Мелехава — Славяне ў Раннім сярэднявякоўі *(VI клас)* — 53

Ольга Забельникова — Колонизация Северной Америки *(VIII класс)* — 61

Неонила Цыганок — Китай в 1910—1920-х годах *(X класс)* — 71

Содержание — 79

Summary — 80



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*

***Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.***
***Тэлефон: 8(017) 395-79-11.***
***http://www.p-shkola.by;***
***e-mail: bhc.redaktor@tut.by.***
***РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".***
Падпісана да друку 19.09.2014 г.
Выхад у свет 26.09.2014 г. Афсетны друк.
Фармат 60x841/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 795 асобнікаў. Зак. 1344.
*Надрукавана ў друкарні ААТ "Прамдрук".*
*Ліцэнзія № 02330/233 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


***Да ведама аўтараў!***
***За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.***


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2014.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Арганізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з выкарыстаннем табліц пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе

*Аўтар прапаноўвае комплекс прыёмаў для эфектыўнай дзейнасці настаўніка і вучняў, засваення гістарычных ведаў і адпаведных спосабаў вучэбнай дзейнасці з выкарыстаннем табліц пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе.*

Пры выкладанні гісторыі Беларусі ў 6 класе важнае месца ў працэсе арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў займае работа з табліцамі. Асаблівасцю фарміравання ўменняў вучняў выконваць заданні з гістарычнымі табліцамі з'яўляецца тое, што менавіта з 6 класа пачынаецца сістэматычнае вывучэнне гісторыі Беларусі на падзейна-храналагічным узроўні, для якога характэрна цэласнасць, адносная паўната і лагічная завершанасць. Гэта стварае аптымальныя ўмовы для засваення вучнямі нацыянальнага кампанента школьных гістарычных ведаў, паступовага фарміравання ў навучэнцаў устойлівай сістэмы ведаў аб гістарычным шляху беларускага народа.

Табліца як дыдактычны сродак, па вызначэнні савецкага спецыяліста ў галіне дыдактыкі гісторыі А.А.Вагіна, — гэта сінтэзаваны матэрыял вывучаемай тэмы, графічнае вызначэнне гістарычнага матэрыялу ў выглядзе параўнальных, тэматычных і храналагічных граф з мэтай іх запаўнення вучнямі[1].

У якасці эфектыўнага сродка навучання табліцы займаюць трывалае месца ў педагагічнай практыцы настаўнікаў гісторыі. Табліцы выкарыстоўваюць і аўтары-складальнікі вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі ў 6 класе[2]. Такая ўвага настаўнікаў гісторыі і метадыстаў тлумачыцца вялікім дыдактычным патэнцыялам дадзеных сродкаў навучання, іх універсалізмам і інфармацыйнай насычанасцю. Выкарыстоўваючца табліцы ў працэсе арганізацыі вучнёўскай дзейнасці часцей за ўсё падчас работы з вялікімі і сістэматызаванымі аб'ёмамі гістарычнага матэрыялу. Настаўнік у гэтым выпадку павінен вырашаць

***ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.***

*Загадчык кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Научно-методические основы создания и применения электронных средств обучения по дисциплинам социально-гуманитарного цикла (на примере истории)" (Мн., 2009), "Электронный учебно-методический комплекс по дисциплинам социально-гуманитарного цикла. Научно-методические основы создания и системного применения" (Мн., 2012); "Информационная компетентность как основа системного применения информационно-коммуникационных технологий в высшем образовании (на примере преподавания социально-гуманитарных дисциплин" (Пинск, 2013).*

дыдактычныя задачы скразнога характару — задачы, якія патрабуюць і ведаў, і навыкаў вызначаць асобнае ці агульнае, параўноўваць, абагульняць і сістэматызаваць, а таксама і ацэньваць. Арганізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з табліцамі спрыяе рэалізацыі вышэйпералічаных задач.

У методыцы выкладання гісторыі вызначаюць наступныя віды табліц:

– тэматычныя (табліцы, якія складаюцца па адной вызначанай тэме);

– параўнальна-абагульняючыя (табліцы, якія афармляюцца для аналіза і супастаўлення гістарычных фактаў, іх параўнальнага абагульнення);

– храналагічныя (табліцы, у якіх паслядоўна размешчаны гістарычныя даты і адпаведныя ім гістарычныя падзеі, факты па адной тэме);

– сінхраністычныя (табліцы, у аснову складання якіх пакладзены факты і падзеі, якія адбываюцца адначасова ў розных частках свету, рэгіёнах, краінах).

У артыкуле мы прывядзем прыклады выкарыстання тэматычных, параўнальна-абагульняючых, храналагічных табліц. Як паказвае практыка, у 6 класе сінхраністычныя табліцы амаль не выкарыстоўваюцца па прычыне несфарміраванасці ў вучняў прасторавага і абстрактнага мыслення*.

Работа з табліцамі пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе павінна праводзіцца паступова, ад простых табліц да больш складаных. Арганізацыя работы з табліцамі павінна адбывацца на падставе фарміравання вучнёўскіх уменняў вызначаць галоўнае і другараднае, выстройваць паслядоўнасць падзей у храналагічным парадку, параўноўваць гістарычныя працэсы і з'явы. Вельмі важным з'яўляецца таксама авалоданне школьнікамі ўменнямі складаць розныя віды планаў і даваць параўнальна-абагульняючыя характарыстыкі. Гэта неабходна для таго, каб складанымі формамі прапанаваных заданняў не адбіць ахвоту ад засваення ведаў аб мінуўшчыне сваёй Радзімы. Так, аўтары падручніка па гісторыі Беларусі для 6 класа прапаноўваюць работу з табліцамі на ўроку абагульнення, пасля вывучэння I раздзела "Беларускія землі ў старажытныя часы". Заданне 2 па дапаўненні табліцы ў сшытку вучань здольны выканаць, працуючы са зместам вучэбнага дапаможніка на с. 6, 7. Аднак, на наш погляд, афармляць, напрыклад, храналагічную табліцу можна пачаць і раней.

Абавязковым патрабаваннем для арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці шасцікласнікаў з'яўляецца выкарыстанне ўсяго метадычнага багацця актыўных метадаў, прыёмаў, сродкаў і форм, якія дазволілі б стымуляваць мысліцельныя працэсы, дасягнуць прадуктыўных вынікаў засваення гістарычных ведаў і эфектыўнасці ў выпрацоўцы спецыяльных спосабаў вучэбнай працы.

Работа з тэматычнымі табліцамі спрыяе лепшаму засваенню як тэарэтычнага, так і фактала-гічнага матэрыялу. Вучні больш трывала засвойваюць гістарычныя тэрміны і паняцці, вучацца ўсебакова аналізаваць факты, рабіць абагульняючыя высновы да табліц. Але гэта дасягаецца ў спалучэнні з работай па складанні сэнсавых і тэзісных планаў. Зразумела, што змест і колькасць слупкоў (граф) залежыць ад абранай тэмы і праблематыкі табліцы. У якасці прыкладаў разгледзім шэраг тэматычных табліц, якія мэтазгодна складаць і выкарыстоўваць пры арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці падчас вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе *(гл. табліцы 1–3)*.

Працаваць з табліцай 1 "Галоўныя дасягненні людзей у старажытныя часы на беларускіх землях" можна пачынаць пры вывучэнні § 1 "Найстаражытнейшыя людзі каменнага веку". Настаўнік паведамляе вучням, што падчас вывучэння раздзела I "Беларускія землі ў старажытныя часы" яны будуць запісваць адпаведную інфармацыю ў слупкі. Задача настаўніка — арганізаваць работу вучняў з вучэбным тэкстам, звяртаць іх увагу на неабходны для запаўнення табліцы матэрыял.

Табліца 2 "Барацьба беларускіх княстваў са знешняй пагрозай у першай палове XIII ст." запаўняецца падчас вывучэння тэмы "Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст." (§ 20). Настаўнік прапаноўвае вучням запісаць у табліцу даты асноўных ваенных дзеянняў, у якіх прымалі ўдзел ваяры беларускіх зямель. У выніку работы табліца запаўняецца наступным чынам.

Пры вывучэнні тэмы "Рэлігія і міфалогія ўсходніх славян" (§ 13), пункта 3 "Язычніцкія багі", як адна з форм вывучэння матэрыялу, настаўнік арганізуе работу з тэкстам гэтага пункта. У выніку работы табліца "Пантэон багоў ва ўсходніх славян" набывае наступны выгляд *(гл. прыклады запаўнення табліц у дадатку на с. 47.)*

---

*Прыклады афармлення зводнай і тэматычнай храналагічнай табліцы, сінхраністычнай табліцы глядзі ў артыкуле А.Корзюка "Лакалізацыя гістарычных фактаў у часе: асноўныя метадычныя прыёмы" // Беларускі гістарычны часопіс. 2013, № 3. С. 39—48.

*Табліца 1*

**Галоўныя дасягненні людзей у старажытныя часы на беларускіх землях**

| Крытэрыі для характарыстыкі старажытных вякоў | Каменны век | Бронзавы век | Жалезны век |
|---|---|---|---|
| Храналагічны перыяд | | | |
| Супольнасці людзей | | | |
| Прылады працы | | | |
| Вынаходніцтвы | | | |
| Заняткі і промыслы | | | |

*Табліца 2*

**Барацьба сярэдневяковых княстваў са знешняй пагрозай у першай палове XIII ст.**

| Дата | Падзея | Удзельнікі | Галоўныя вынікі |
|---|---|---|---|
| | | | |

*Табліца 3*

**Пантэон багоў ва ўсходніх славян**

| Імя бога | Якія сілы прыроды прадстаўляў і якія бакі жыцця чалавека апекаваў |
|---|---|
| | |

Табліцу 1 мэтазгодна прапанаваць запоўніць шасцікласнікам для фарміравання ўмення суадносіць гістарычныя факты (падзеі) з пэўнымі гістарычнымі перыядамі. На працягу вывучэння матэрыялу раздзела (§ 1—7) яны ўносяць у таблічную форму факты (падзеі), якія маюць дачыненне да азначаных гістарычных перыядаў. Падчас правядзення этапнага кантролю шасцікласнікам прапаноўваецца самастойна, без вучэбнага дапаможніка запоўніць табліцу ці яе асобную тэматычную частку — слупок.

Вельмі важным метадычным патрабаваннем для выканання заданняў па складанні табліцы з'яўляецца безумоўная наяўнасць высновы. На гэты дыдактычны аспект часцей за ўсё настаўнікі не звяртаюць увагі. Выкананне табліцы толькі дзеля выканання табліцы — гэта відавочная педагагічная бязглуздзіца!

Выснова да табліцы павінна фармулявацца ў адпаведнасці з мэтамі і зместам выкананай работы. Дзеля гэтага шасцікласнікаў неабходна вучыць на прыкладах матэрыялу вучэбнага дапаможніка адрозніваць высновы ацэньваючыя, аналітычныя, высновы-пералічэнні. У саміх фармулёўках заданняў да табліц неабходна абавязкова арыентаваць вучняў на від высновы, які неабходна зрабіць. Авалоданню прыёмам фармулявання высновы дапамагаюць вучэбныя памяткі. Прывядзем два прыклады такой памяткі.

**Памятка**

**Як зрабіць ацэньваючую выснову аб гістарычнай падзеі**

1. Прыгадайце галоўнае з праслуханага або прачытанага матэрыялу: а) асноўныя факты; б) сувязі прычыны і вынікі паміж імі; в) ацэнку, значэнне гэтых фактаў, іх ролю і месца ў гістарычным развіцці.

2. Вызначыце: а) што аб'ядноўвае паміж сабою гэтыя факты: прычыны іх узнікнення, наступствы, што ў іх агульнага; б) што ў кожнай групе фактаў асаблівага і спецыфічнага.

**Памятка**

**Як зрабіць ацэньваючую выснову аб гістарычнай падзеі**

Прааналізуйце падзею і вызначыце: 1) яе прычыны; 2) характар; 3) асноўныя этапы; 4) супярэчнасці; 5) сувязь і пераемнасць з іншымі гістарычнымі падзеямі; 6) значэнне і вынік для яе ўдзельнікаў і далейшага гістарычнага развіцця.

**Параўнальна-абагульняючыя табліцы**, як адзначалася намі раней, з'яўляюцца вынікам параўнання і абагульнення, аналізу і супастаўлення гістарычных фактаў, падзей. Адказным момантам па стварэнні дадзенага віду табліц з'яўляецца вызначэнне ліній (крытэрыяў) параўнання разглядаемых падзей, працэсаў і з'яў. Настаўніку разам з вучнямі неабходна вызначыць такія крытэрыі. Спачатку ў тэксце вучэбнага дапаможніка вучні разам з настаўнікам адзначаюць сутнасныя прыкметы (лініі), па якіх неабходна правесці супастаўленне, і фармулююць іх у выглядзе пунктаў плана. Іх запісваюць у першую калонку табліцы. Прывядзем прыклады складання такіх табліц *(гл. табліцы 4, 5)*.

Табліца 4 "Усходнеславянскія племянныя аб'яднанні на тэрыторыі Беларусі" афармляецца пры вывучэнні § 10 "Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі". Настаўнік прапаноўвае агульнае і адметнае кожнага племені. У выніку работы яна набывае наступны выгляд *(гл. дадатак на с. 48)*.

*Табліца 4*

**Усходнеславянскія племянныя аб'яднанні на тэрыторыі Беларусі**

| Прыкметы для параўнання | Крывічы-палачане | Дрыгавічы | Радзімічы |
|---|---|---|---|
| Паходжанне назвы племяннога аб'яднання | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэрыторыя рассялення | | | |
| Суседнія племянныя аб'яднанні | | | |
| Этнічныя асаблівасці | | | |

Складанне параўнальна-абагульняючых табліц дазваляе выпрацаваць неабходны алгарытм вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Вучні вызначаюць адзінкавыя, асабістыя і агульныя прыкметы. Запаўненне табліцы адбываецца праз занясенне ў яе змест інфармацыі па кожнай з абраных прыкмет (ліній). Па ходзе запаўнення табліцы шасцікласнікі актуалізуюць, сістэматызуюць і абагульняюць раней атрыманыя веды і інтэгруюць новыя. Пры гэтым яны фарміруюць цэласнае ўяўленне аб гістарычным мінулым Радзімы, усведамляюць заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага грамадства, ацэньваюць непаўторнасць і ўнікальнасць кожнага факта. Зразумела, што дадзены від табліц магчыма выкарыстоўваць пры наяўнасці ў вучняў практычных уменняў складаць простыя ці разгорнутыя планы.

**Храналагічная табліца** па гісторыі Беларусі можа мець просты ці ўскладнёны выгляд. У першым варыянце яна складаецца са слупкоў (графаў) "Дата", "Падзея" *(гл. табліцу 5)*.

*Табліца 5*

**Галоўныя падзеі каменнага веку на беларускіх землях**

| Дата | Падзея |
|---|---|
| | |

У другім варыянце табліца выглядае больш складаная, з дабаўленнем новага слупка "Значэнне" *(гл. табліцу 6)*. Фіксацыі, абагульненню і сістэматызацыі падлягае ў дадзеным выпадку не толькі фактталагічны (у тым ліку храналагічны і картаграфічны), але і ацэначны кампанент школьных гістарычных ведаў.

Неабходна адзначыць, што, згоднай з вучэбнай праграмай і патрабаваннямі іншых нарматыўных актаў, за час вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе вучням неабходна авалодаць спецыяльнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, звязанымі з лакалізацыяй гістарычных падзей, з'яў, працэсаў у часе і прасторы:

— называць даты гістарычных падзей;

— вызначаць паслядоўнасць і працягласць гістарычных падзей;

— ведаць перыядызацыю гісторыі Беларусі старажытных часоў і Сярэдневякоўя;

— суадносіць даты падзей гісторыі Беларусі са стагоддзем;

— вызначаць узаемасувязі гістарычных дат з гістарычнымі фактамі і гісторыка-геаграфічнай прасторай;

— выкарыстоўваць храналагічныя веды і сфарміраваныя храналагічныя ўяўленні для пабудовы неабходных высноў і абагульненняў[3].

Зразумела, што выканаць заданне па складанні храналагічнай табліцы вучань будзе здольны ў выпадку, калі ў яго будуць сфарміраваны навыкі ацэньвання гістарычных фактаў, падзей, з'яў. Наяўнасць падобных уменняў, устойліва рэалізаваных праз навыкі, — гэта ўжо паступовае складванне светапогляду.

Вывучэнне дат, фактаў, іх лакалізацыя ў гістарычна-геаграфічнай прасторы садзейнічае фарміраванню ў вучня ўмення не толькі сістэматызаваць гістарычныя факты, але і аб'ектыўна асэнсоўваць іх, аналізаваць гістарычнае мінулае. Трывалае засваенне шасцікласнікамі храналогіі падзей дазваляе зразумець сутнасць гістарычнага працэсу, сфарміраваць уласнае стаўленне як да падзей мінулага, так і да сучаснасці. Дадзеныя аспекты настаўнік павінен абавязкова ўлічваць пры мадэляванні структуры вучэбнага занятку, вызначэнні ў ім месца для заданняў па складанні табліцы.

Фарміраваць храналагічныя веды і ўменні ў шасцікласнікаў неабходна з улікам іх псіхалагічнага развіцця. На гэты момант мы звярталі ўвагу ў мінулай публікацыі[4]. Настаўнік павінен улічваць той факт, што асабісты жыццёвы вопыт вучняў не суадносіцца са шматвяковай гісторыяй чалавецтва, гісторыяй Радзімы. Таму рэкамендацыя для настаўніка — фарміраваць і развіваць храналагічныя ўяўленні і веды вучняў з дапамогай яркіх галоўных характарыстык гістарычнага часу: лінейнасць, незваротнасць, адпаведная працягласць. Для гэтага настаўнікам гісторыі часцей за ўсё выкарыстоўваецца ўжо знаёмая для вучняў "стужка часу". Дыдактычна апраўданым з'яўляецца і выкарыстанне прыгаданай намі храналагічнай табліцы. Пры гэтым важную ролю ў арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці шасцікласнікаў па выкананні заданняў з табліцамі адыгрываюць прыёмы работы з тэкстам вучэбнага дапаможніка: знайсці ў канкрэтным абзацы тэксту ці ў пункце параграфа новыя для вучняў даты, звязаныя з імі гістарычныя факты, падзеі і занесці іх у сшытак у выглядзе храналагічнай табліцы.

Дзейсным сродкам работы з храналагічнай таблiцай з'яўляецца выкарыстанне табліцы, у якую вучню неабходна праставіць наўмысна прапушчаныя факты, падзеі, даты, асобы і інш. Актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць вучня можа і заданне з храналагічнай табліцай, у якой настаўнікам наўмысна дапушчаны шэраг грубых памылак. Іх вучань шукае і правіць. У працэсе арганізацыі вучнёўскай дзейнасці ў 6 класе ў гэтым выпадку, безумоўна, неабходна вітаць элементы гульні і спаборніцтва. Зразумела, што змест на-

паўнення табліц, прапанаваных для выканання падобных заданняў, павінен абапірацца на вучэбны матэрыял, выкладзены ў вучэбным дапаможніку. Узровень цяжкасці задання настаўнік выбірае з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў.

***Сінхраністычная табліца*** з'яўляецца прыкладам аднаго з найбольш складаных сродкаў навучання. І справа тут не толькі ў колькасці часу на яе стварэнне. Дадзеная таблічная форма распрацоўваецца і выкарыстоўваецца для больш паглыбленага вывучэння гісторыі Радзімы на фоне цывілізацыйных працэсаў і падзей, якія адбываліся ці адбываюцца ў іншых частках свету, рэгіёнах і краінах. Працу з падобнымі табліцамі варта арганізоўваць на факультатыўных занятках, з найбольш падрыхтаванымі вучнямі. У змесце табліцы факты, падзеі і асобы магчыма падаваць ці спрошчана (без апісання іх сутнасці і каментарыя), ці са скарочанымі і канкрэтызаванымі тлумачэннямі. Складанне вучнямі сінхраністычнай табліцы па гісторыі Беларусі ў 6 класе з'яўляецца вельмі цяжкім заданнем, якое патрабуе трывалых ведаў усеагульнай гісторыі. Тым не менш работа з сінхраністычнай табліцай дазваляе шасцікласніку:

— разглядаць гісторыю Беларусі ў кантэксце агульнага развіцця сусветных цывілізацый;

— глыбей разумець гістарычны працэс у яго адзінстве і шматзначнасці;

— вызначаць заканамернасці ў змене гістарычных падзей, якасных характарыстык на колькасныя (і наадварот);

— адсочваць узаемаўплыў іншых цывілізацый і культур на Беларусі;

— больш трывала засвойваць гістарычную інфармацыю;

— фарміраваць і далей развіваць навыкі лагічнага мыслення (аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульненне і сістэматызацыя).

Прыведзеныя ў якасці прыкладаў прыёмы работы з таблічнымі формамі настаўнік можа прымяняць на розных этапах вучэбнага занятку: засваенне вучэбнага матэрыялу; сістэматызацыя і абагульненне вывучанага гістарычнага матэрыялу; кантроль і карэкцыя ўзроўню засваення вучэбнага гістарычнага матэрыялу, а таксама сфарміраванасці спосабаў вучэбнай дзейнасці. Падчас выкарыстання прапанаваных прыёмаў пры арганізацыі дзейнасці вучняў настаўнік павінен улічваць, што да кожнага вучня неабходна знайсці індывідуальны падыход і імкнуцца, каб кожны вучань дасягнуў станоўчых вынікаў.

Для эфектыўнай арганізацыі працэсу фарміравання і далейшага развіцця ўменняў работы вучняў 6 класа з гістарычнымі табліцамі настаўнік гісторыі павінен улічваць наступнае:

— фарміраванне і развіццё ўменняў павінна ажыццяўляцца сістэматызавана з мэтай засваення шматкампанентнага складу вучэбных гістарычных ведаў і спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

— фарміраванне ўменняў працаваць з гістарычнымі табліцамі розных відаў з'яўляецца вельмі складаным і працяглым працэсам. Аднак гэта дазваляе раскрыць якасныя і колькасныя асаблівасці вывучаемых аб'ектаў;

— працэс фарміравання ўменняў працы з гістарычнымі табліцамі павінен абапірацца на ўменні вызначаць галоўнае і другараднае, асобнае і агульнае, абагульняць і сістэматызаваць атрыманыя веды, ацэньваць гістарычныя падзеі і факты, складаць розныя віды планаў і параўнальна-абагульняючыя характарыстыкі, рабіць высновы;

— працэс фарміравання ўменняў працы з табліцамі павінен абапірацца на разуменне вучнямі якасцяў часу і паступовае засваенне імі ўзаемасувязяў гістарычнай даты, гістарычнага факта (падзеі) і гісторыка-геаграфічнай прасторы;

— паспяховае фарміраванне ўменняў работы з табліцамі па гісторыі Беларусі адбываецца эфектыўна ва ўзаемасувязі з вывучэннем усеагульнай гісторыі;

— пры выбары канкрэтных прыёмаў і сродкаў выкладання гістарычнага матэрыялу з выкарыстаннем табліц на кожным уроку неабходна арыентавацца на комплекснасць і сістэмнасць адбіраемых для прымянення элементаў дыдактычных інструментарыяў;

— арганізаванае навучанне гісторыі Беларусі павінна фарміраваць у вучня ўяўленне аб сістэмным гістарычным працэсе як шляху развіцця гістарычных падзей і датах як этапах гістарычнага развіцця беларускага грамадства ў межах агульнаеўрапейскай і сусветнай прасторы.

Вызначаныя палажэнні неабходна ўлічваць у якасці метадычных умоў для павышэння эфектыўнасці працэсу навучання пры арганізацыі і ажыццяўленні вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе.

---

[1] Вагин А.А. Методика преподавания истории в средней школе. М., 1984. С. 224.

[2] Штыхаў Г.В. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г.В.Штыхаў, С.М.Цемушаў, В.У.Ракуць; пад рэд. Г.В.Штыхава, Ю.М.Бохана. Мн., 2009.

[3] Усеагульная гісторыя. Гісторыя Беларусі. V–XI класы. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мн., 2012. С. 4–5; Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" / Беларускі гістарычны часопіс. 2009, № 6. С. 14—16.

[4] Лазіцкі В.Л. Арганізацыя вучэбнай дзейнасці па развіццю храналагічных уяўленняў і ведаў вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе // Беларускі гістарычны часопіс. 2013, № 6. С. 56—60.

*Дадатак*

*Табліца 1*

**Галоўныя дасягненні людзей у старажытныя часы на беларускіх землях**

| Крытэрыі для характарыстыкі старажытных вякоў | Каменны век | Бронзавы век | Жалезны век |
|---|---|---|---|
| Храналагічны перыяд | 100—35 тыс. гадоў таму —канец 3-га тыс. да н. э. | Пачатак 2-га тыс. да н. э. — канец VIII ст. да н. э. | VII ст. да н. э. — V ст. н. э. |
| Супольнасці людзей | Родавая абшчына (мацярынскі род), племя | Вялікая патрыярхальная сям'я, родавая абшчына (бацькоўскі род), племя | Вялікая патрыярхальная сям'я, родавая абшчына (бацькоўскі род), племя |
| Прылады працы | Крэмянёвыя востраканечнікі, дзіды (коп'і), скрабкі, разцы, каменная сякера, сеткі для лоўлі рыбы, вуды, лодкі, сіло, сетка, лук | Медныя, бронзавыя нажы, наканечнікі дзідаў, сякеры, сярпы, рала, барана-сукаватка | Жалезныя сякеры, наканечнікі, дзідаў, нажы |
| Вынаходніцтвы | Здабыча агню, выраб лука, стрэл | Арганізацыя вытворчай гаспадаркі, свідравання з дапамогай трубчатай косткі | Выкарыстанне печаў-домніц для апрацоўкі жалезнай руды |
| Заняткі і промыслы | Збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства, збор мёду дзікіх пчол, лоўля птушак, выраб глінянага посуду | Паляванне, збіральніцтва, жывёлагадоўля, падсечна-агнявое і ворнае земляробства | Мужчыны: выраб прылад працы, жывёлагадоўля, падсечна-агнявое земляробства, прыручэнне і гадоўля свойскіх жывёл, паляванне, рыбалоўства, ахова сваёй тэрыторыі. Жанчыны: абаграванне жылля, гатаванне ежы, выраб адзення і абутку, збор ураджаю, збіральніцтва, догляд дзяцей |

*Табліца 2*

**Барацьба сярэдневяковых княстваў са знешняй пагрозай у першай палове XIII ст.**

| Дата | Падзея | Удзельнікі | Галоўныя вынікі |
|---|---|---|---|
| 1203 г. | Аблога нямецкіх крэпасцей Ікскюль і Гольм | Полацкі князь Уладзімір, крыжакі | Крыжакі адкупіліся грашыма, але па-ранейшаму прадаўжалі захопы зямель Полацкага княства |
| 1206 г. | Аблога крэпасці Гольм | Полацкі князь Уладзімір, крыжакі | Уладзімір крэпасць не захапіў, пасля заключэння "вечнага" міру Уладзімір адмовіўся ад тэрыторыі Ніжняга Падзвіння, ад даніны з яе насельніцтва |
| 1240 г. | Бітва на р. Нява | Шведскія рыцары, наўгародскае войска на чале з Аляксандрам Неўскім, Якаў Палачанін | Паражэнне шведскіх войскаў |
| 1241 г. | Бітва каля Берасця | Войска мангола-татараў, беларускія дружыны | Шмат людзей загінула пад Бярэсцем, беларускія землі не спазналі нашэсця войск Батыя |
| Другая палова XIII ст. | Бітва каля г. Крутагор'е | Мангольскія войскі, беларускія воіны | Мангольскі военачальнік загінуў |
| Другая палова XIII ст. | Набегі на беларускія, украінскія, літоўскія землі | Войскі татараў-ардынцаў | Захоп людзей у палон і продаж у рабства |